УДК 808.26 (075.8)

# Электронныя вучэбна-метадычныя комплексы па лінгвістычных дысцыплінах: сучасны стан і перспектывы развіцця

І.У. Будзько, І.Л. Капылоў
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

Ужо дваццаць гадоў ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь чытаецца курс “Беларуская мова: прафесійная лексіка”, арыентаваны на паглыбленне ведаў нацыянальнай мовы і авалоданне студэнтамі прынцыпамі навуковага стылю маўлення і спецыяльнай тэрміналогіяй на беларускай мове. Асабліва актуальнай дадзеная дысцыпліна з’яўляецца пры падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне дзяржаўнага кіравання, паколькі ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму кожны служачы абавязаны прафесійна валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі.

Для навучання студэнтаў спецыяльнасці “Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка” плануецца стварыць электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) па дысцыпліне “Беларуская мова: прафесійная лексіка”. Плануемы ЭВМК будзе мець наступную структуру: уводны карэкціровачны курс па арфаграфіі і пунктуацыі з ілюстрацыйным матэрыялам, арыентаваным на будучую прафесійную дзейнасць студэнтаў; курс лекцый з наступнымі раздзеламі: мова і грамадства; гістарычныя этапы развіцця беларускай мовы; лексіка, лексікалогія, фразеалогія; функцыянальныя стылі беларускай мовы; тэрміны і спецыфіка беларускай навуковай тэрміналогіі; культура мовы. У якасці ілюстрацыйнага і анімацыйнага матэрыялу да лекцыйнага курса прапануюцца прэзентацыі аб гістарычным беларускім

пісьменстве, аб вядомых персаналіях беларускай культуры і літаратуры, аб гісторыі развіцця беларускага пісьма.

Практычны модуль будзе складацца з тэставых заданняў, заданняў для самакантролю і кантролю з боку выкладчыка; узораў афармлення дзелавых папер па-беларуску, а таксама ўзораў аўдыядыялогаў з афіцыйнай сферы дзейнасці грамадства па-беларуску з мэтай выпрацоўкі навыкаў вуснага маўлення на беларускай мове ў прафесійнай дзейнасці будучых кіраўнікоў. Увядзенне дадзенага мультымедыйнага ВМК у вучэбны працэс дазволіць павысіць моўную кампетэнцыю студэнтаў і ўзровень валодання імі вусным маўленнем у прафесійнай сферы камунікацыі, пашырыць іх прафесійны слоўнікавы запас (як на рускай, так і на беларускай мовах), развіць навыкі ўжывання беларускай мовы ў прафесійнай сферы.

Асноўнымі патрабаваннямі да вывучэння нацыянальнай дзяржаўнай мовы як сродку фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых кіраўнікоў з'яўляецца прафесійная матывацыя, наяўнасць профільнага дапаможніка, выкарыстанне наглядных дапаможнікаў і міжпрадметных сувязей, улік зместу будучай прафесійнай дзейнасці.

Выкарыстанне інавацыйных адукацыйных тэхналогій у ВНУ, уключаючы дыстанцыйнае навучанне, запавольваецца з прычыны адсутнасці эфектыўных электронных адукацыйных рэсурсаў (ЭАР).

Распрацоўка электронных вучэбна-метадычных комплексаў (ЭВМК) з'яўляецца прыярытэтным напрамкам сучаснай сістэмы адукацыі. Укараненне інфармацыйных тэхналогій у вучэбны працэс дазволіць павысіць якасць падрыхтоўкі будучага кіраўнічага персаналу, аптымізаваць навучальны працэс і ў кароткія тэрміны дасягнуць эфектыўных вынікаў.

Мультымедыйныя вучэбныя дапаможнікі з'яўляюцца новым відам сродкаў навучання, які можа шырока

выкарыстоўвацца як для аўдыторнай адукацыі, так і для дыстанцыйнай. Мультымедыйныя навучальныя сістэмы дазваляюць гарманічна аб'ядноўваць лекцыю з дэманстрацыяй вучэбнага матэрыялу, практыкум у выглядзе камп'ютарнага імітатара, тэставую сістэму і ўсе дадатковыя матэрыялы ў адзіным інтэрактыўным камп'ютарным дапаможніку. Інфармацыйныя тэхналогііі даюць магчымасць не толькі інтэнсіфікаваць працэс падрыхтоўкі будучага спецыяліста, але і забяспечыць авалоданне ім міждысцыплінарнымі сувязямі. Электронныя вучэбна-метадычныя комплексы аб'ядноўваюць у адным працэсе засваенне тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, што неабходна пры вывучэнні любой лінгвістычнай дысцыпліны. Тэставыя заданні, распрацаваныя для адпаведнай спецыяльнасці, дазволяць замацаваць прафесійныя навыкі ў канкрэтнай сферы дзейнасці будучага спецыяліста.

Імклівы рост і пашырэнне інфармацыйных тэхналогій патрабуе ўключэння іх і ў педагагічны працэс вышэйшай школы, таму надзвычай актуальным з'яўляецца распрацоўка і ўкараненне ў педагагічную практыку сучасных ЭВМК па асноўных дысцыплінах, якія выкладаюцца ў ВНУ. Першыя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены ў вядучых ВНУ краіны (БДУ, БДЭУ, БДУІР, БНТУ), дзе створаны ЭВМК па праграмаванні, матэматыцы, асновах псіхалогіі, эканамічнай тэорыі і інш.

Кожны ЭВМК павінен валодаць пэўнымі інтэрактыўнымі магчымасцямі. Напрыклад, раздзелы зместу мусяць мець аўтаматычны пераход да адпаведных тэкставых раздзелаў; неабходна, каб ЭВМК уключаў сістэму гіперспасылак, навігацыйную сістэму пры дапамозе кнопак пераходу, сістэму паўнатэкставага пошуку, сістэму кантролю тэставых заданняў. Змест дысцыпліны абумоўлівае магчымасць убудоўвання інтэрактыўных мадэляў вывучаемых працэсаў. У ЭВМК павінны падтрымлівацца мультымедыйныя

магчымасці: праігрыванне флэшанімацый, відэафрагментаў, аудыязапісаў, прэзентацый для чытання лекцыйнага курса. Рэкамендуецца, каб кантэнт не залежыў ад апаратна-праграмных сродкаў. [1, 198].

Пры стварэнні ЭВМК варта надзяляць увагу і тэрмінам жыццяздольнасці электронных праграм, якія будуць падтрымліваць дзейнасць рэсурсу. На сённяшні дзень самыя доўгатэрміновыя праграмныя прадукты не разлічаны больш як на 10 гадоў, а звычайна яны састарэюць ужо праз два-тры гады, таму пажадана, каб матэрыял, якім напаўняецца вучэбна-метадычны комплекс, быў незалежным ад сродкаў прадстаўлення і падтрымліваўся агульнапрынятымі фарматамі.

Стварэнне ЭВМК па дысцыпліне "Беларуская мова: прафесійная лексіка" з'яўляецца надзвычай важнай і актуальнай задачай, паколькі такі комплекс дазваляе значна пашырыць самастойную работу студэнтаў, стварыць цікавую і разнастайную сістэму кантролю ведаў, уключыць у адукацыйны працэс разнастайныя аудыя- і відэаматэрыялы, што з'яўляецца вельмі запатрабаваным у лінгвадыдактыцы. ЭВМК па лінгвістычных дысцыплінах толькі пачынаюць ствараццца, звесткі аб іх досыць разрозненыя, стыхійна раскіданыя ў Ітэрнэце.

У розных ВНУ Беларусі створаны шэраг электронных дапаможнікаў па дысцыпліне "Беларуская мова: прафесійная лексіка":

– з пашырэннем *электронны рэсурс* у сетцы Інтэрнэт прадстаўлены дапаможнік "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" Н.А. Радзіваноўскай, М.А. Санкевіч, Д.С. Томчыка, В.М. Шавель, М.В. Швед, які вызначаецца як *вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў дыстанцыйнай формы навучання па спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на АПК"*, папяровая версія дапаможніка выйшла ў Баранавічах у 2009г.;

– як электронная кніга аформлены вучэбны дапаможнік А.М.Лапкоўскай “Беларуская мова (Прафесійная лексіка)” для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па педагагічных спецыяльнасцях, папяровая версія кнігі выйшла ў Гродне ў 2008 годзе [2]. Дапаможнік уключае асноўныя раздзелы курса, пасля кожнага раздзела маюцца пытанні і заданні. Кніга забяспечана аўтаматычным пераходам ад зместу да адпаведных тэматычных раздзелаў, сярод якіх вылучаюцца наступныя: мова і маўленне; лексіка беларускай мовы паводле сфер яе выкарыстання; беларуская навуковая тэрміналогія; лексікаграфія, тэрмінаграфія; стылістыка, асаблівасці навуковага стылю; афіцыйна-дзелавыя дакументы і паперы; тэорыя і практыка перакладаў навуковых тэкстаў з рускай мовы на беларускую; у якасці дадаткаў прадстаўлены тры кароткія слоўнікі тэрмінаў па дэфекталогіі, педагогіцы і псіхалогіі, у дадатку таксама змешчаны тэксты навуковага стылю мовы для самастойнага перакладу. Падобную структуру і прынцыпы падачы матэрыялу мае дапаможнік, створаны ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы (аўтары А.М. Асіпчук, В.В. Маршэўская, А.С.Садоўская) [3];

– арыгінальнасцю структуры і спосабаў падачы тэарэтычнага матэрыялу вылучаецца дапаможнік “Беларуская мова. Прафесійная лексіка”, падрыхтаваны калектывам выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта [4]. Дадзены дапаможнік уключае наступныя раздзелы: мова ў гісторыі народа, стылістыка і культура маўлення, самастойныя і службовыя часціны мовы ў навуковым стылі, тэхнічная тэрміналогія. Пасля кожнага раздзела падаюцца пытанні і практычныя заданні. Відавочна прэваліраванне тэарэтычнага матэрыялу над практычным;

– верагодна, электроннай версіяй папяровага вучэбна-метадычнага дапаможніка з’яўляецца ЭВМК “Беларуская мова: спецыяльная лексіка: Вучэбна-метадычны дапаможнік

для студэнтаў усіх форм навучання ўсіх спецыяльнасцей БДУІР / Аўтары: Л.А. Бондар, Н.Г. Вайніла, М.А. Галянок і інш.; пад рэд. Ю.А. Сцепанчука”, які выйшаў у Мінску ў 2006 годзе [5]. Дапаможнік уключае наступныя раздзелы: гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы; білінгвізм, моўная інтэрферэнцыя; лексікалогія; лексікаграфія; лексічны склад навуковага стылю, спецыфіка ўжывання тэрміналагічнай лексікі; сістэма жанраў навуковай літаратуры; пісьмовыя дакументы ў сферы афіцыйна-справавых зносін. На наяўнасць электроннай версіі дадзенага дапаможніка ўказвае спасылка ў інтэрнэце, адкрытага доступу да яго няма;

– па новых патрабаваннях, якія прад’яўляюцца да вучэбна-метадычных комплексаў, пабудавана праца А.І.Зянько і С.А. Вялюгі “Беларуская мова. Прафесійная лексіка: Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці “Правазнаўства”, папяровая версія якой выйшла ў Полацку ў 2005 годзе [6], даступнай з’яўляецца яе электронная версія. Комплекс складаецца з дзвюх частак. У першай прадстаўлены тэарэтычны матэрыял, які адлюстраваны ў наступных раздзелах: паходжанне і развіццё сучаснай беларускай мовы; фанетыка як мовазнаўчая навука, фаналогія; арфаэпія; графіка; арфаграфія; лексікалогія, лексікаграфія; фразеалогія; стылістыка і культура маўлення; марфеміка і словаўтварэнне; марфалогія як раздзел граматыкі; сінтаксіс, пунктуацыя. У другой частцы, якая ўласна і з’яўляецца наватарскай, прадстаўлены практычны модуль засваення тэарэтычнага матэрыялу, кожны блок уключае схему вывучэння новага матэрыялу, матэрыялы для семінараў-практыкумаў, слоўнік асноўных паняццяў і рэкамендаваную літаратуру. У канцы маюцца кантрольныя тэсты і заданні, а таксама матэрыялы для кіруемай самастойнай работы студэнтаў. Электронны варыянт дадзенага дапаможніка цалкам паўтарае папяровую копію;

– не вылучаецца наватарскімі прынцыпамі пабудовы і дапаможнік па дадзенай дысцыпліне, які выйшаў у БНТУ з пашырэннем *электронны вучэбны матэрыял*. Ён уяўляе сабой скарочаную электронную копію папяровага выдання [7]. Электронны вучэбны матэрыял абсталяваны сістэмай гіперспасылак, аўтаматызаванага пераходу ад зместу да тэкставых раздзелаў, з якіх вылучаны наступныя: уводзіны ў навуку аб мове; з гісторыі пісьма; паходжанне і развіццё беларускай мовы; кантрольныя пытанні і заданні; у дадатках змешчаны асноўныя біяграфічныя звесткі аб вядомых дзеячах беларускай літаратуры і культуры; функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы; стылістыка афіцыйна-справавых дакументаў. Арфаграфічны і пунктуацыйны матэрыял, які змяшчаецца ў дадзеным выданні, скарэкціраваны па сучасных правілах арфаграфіі і пунктуацыі. Паколькі па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” у БНТУ маецца дапаможнік з 4-х частак, чакаецца, што аналагічныя электронныя вучэбныя матэрыялы выйдуць і адпаведна наступным часткам дапаможніка;

– ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, падрыхтаваны прафесарам кафедры беларускай і замежных моў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь доктарам філалагічных навук Мароз В.К і дацэнтам гэтай жа кафедры кандыдатам філалагічных навук Каценка А.В., прызначаны для ажыццяўлення адукацыйных праграм па спецыяльнасцях 1-24 01 02 “Правазнаўства”, 1-24 01 03 “Эканамічнае права”, 1-93 01 02 “Судовая экспертыза”. Структурнымі элементамі ЭВМК з’яўляюцца: праграмны, тэарэтычны, практычны, метадычны элемент і іншыя матэрыялы. У праграмным элеменце размешчана вучэбная праграма па дысцыпліне, у тэарэтычным – вучэбны дапаможнік і курс лекцый, у практычным – практыкум, тэставыя заданні па кожнай тэме, вучэбны трэнажор па

кожнай тэме, у метадычным – метадычныя рэкамендацыі па вывучэнні дысцыпліны. Практычны элемент дазваляе сфарміраваць уменні і навыкі, вучэбна-метадычнае забеспячэнне накіравана на забеспячэнне кіруемай самастойнай работы. У раздзеле “Іншыя матэрыялы” змешчаны лексічны юрыдычны мінімум, тэксты для перакладу. Змест і структура ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” у поўным аб’ёме адпавядае тыпавой вучэбнай праграме і нарматыўным патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;

– у рамках дзяржаўнай падпраграмы навуковых даследаванняў “Беларуская мова і літаратура” калектывам аўтараў з ліку выкладчыкаў філалагічнага факультэта БДУ пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры сучаснай беларускай мовы З.І. Бадзевіч ствараецца мультымедыйны падручнік па беларускай мове, у якім спалучаецца тэарэтычны і практычны матэрыял, прэзентуемы сродкамі праграмнага забеспячэння і мультымедыйнай інфармацыяй. Інавацыйнасць дадзенай распрацоўкі заключаецца ў стварэнні спецыяльных праграм для вывучэння асобных раздзелаў беларускай мовы, што дазволіць карыстальнікам самастойна карэкціраваць і рэдагаваць тэарэтычны і практычны матэрыял.

Прааналізаваўшы існуючыя электронныя вучэбныя дапаможнікі па дысцыпліне “Беларуская мова: прафесійная лексіка”, можна зрабіць дзве высновы. Па-першае, практычна ўсе яны з’яўляюцца электроннымі версіямі папяровых выданняў па дадзенай дысцыпліне, якія раней з’явіліся ў друку. Многія з іх узніклі яшчэ ў тыя часы, калі на дадзеную дысцыпліну ў няпрофільных ВНУ адводзілася каля 90 аўдыторных гадзін, за якія можна было даць разнастайны тэарэтычны матэрыял і шматлікія практычныя заданні. Па-другое, ніводзін з прааналізаваных дапаможнікаў, за выключэннем ЭВМК, падрыхтаванага ў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, не называецца ўласна ЭВМК (адзначаны

пашырэнні тыпу *электронны рэсурс, электронная кніга, электронны вучэбны матэрыял*) і не адпавядае асноўным патрабаванням да такога тыпу выданняў.

Для дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі неабходнай умовай з'яўляецца высакаякасная моўная адукацыя кіраўнічых кадраў. Эфектыўнасць лінгвістычнай адукацыі студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей шмат у чым залежыць ад якасці і прэзентабельнасці матэрыялу, якім неабходна авалодаць будучым кіраўнікам. Укараненне інфармацыйных тэхналогій у дыдактычны працэс дазволіць значна павялічыць яго магчымасці, пераўтварыць студэнта з пасіўнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу ў актыўнага, стымуляваць у яго творчы падыход да засваення навучальных дысцыплін, індывідуалізаваць вучэбны працэс. Мультымедыйныя навучальныя сродкі дазваляюць спалучыць усе віды засваення новай інфармацыі: аўдыявізуальнай, прадуктыўнай і рэпрадуктыўнай.

Улічваючы сучасны ўзровень развіцця інфармацыйных тэхналогій, плануемы вучэбна-метадычны комплекс стане не толькі электронным адукацыйным рэсурсам, але і вучэбна-метадычным комплексам новага пакалення, які можа быць рэалізаваны ў розных праграмах, якія інтэгравана і ўзаемазвязана выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе: DVD-ROM – версія для самастойнай работы ў аўтаномным рэжыме за камп'ютарам; Сеткавая-версія для калектыўнага навучання ў лакальнай сетцы ВНУ; SCORM-версія для арганізацыі дыстанцыйнага навучання ў LMS-асяроддзі, ON-LINE-версія, калі тэмы заняткаў транслююцца з аддаленага сервера; MOBIL-версія, калі навучанне ажыццяўляецца з дапамогай КПК або смартфонаў, КНІЖНАЯ-версія – "цвёрдая копія" – канспект лекцый.

Распрацоўка электронных вучэбна-метадычных комплексаў (ЭВМК) з'яўляецца прыярытэтным напрамкам сучаснай сістэмы адукацыі. Укараненне інфармацыйных

тэхналогій у вучэбны працэс дазволіць павысіць якасць падрыхтоўкі будучага кіраўнічага персаналу, аптымізаваць навучальны працэс і ў кароткія тэрміны дасягнуць эфектыўных вынікаў.

Мультымедыйныя вучэбныя дапаможнікі з'яўляюцца новым відам сродкаў навучання, які можа шырока выкарыстоўвацца як для аўдыторнай адукацыі, так і для дыстанцыйнай. Мультымедыйныя навучальныя сістэмы дазваляюць гарманічна аб'ядноўваць лекцыю з дэманстрацыяй вучэбнага матэрыялу, практыкум у выглядзе камп'ютарнага імітатара, тэставую сістэму і ўсе дадатковыя матэрыялы ў адзіным інтэрактыўным камп'ютарным дапаможніку. Інфармацыйныя тэхналогіі даюць магчымасць не толькі інтэнсіфікаваць працэс падрыхтоўкі будучага спецыяліста, але і забяспечыць аваладанне ім міждысцыплінарных сувязей. Электронныя вучэбна-метадычныя комплексы аб'ядноўваюць у адным працэсе засваенне тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, што неабходна пры вывучэнні любой лінгвістычнай дысцыпліны. Тэставыя заданні, распрацаваныя для адпаведнай спецыяльнасці, дазволяць замацаваць прафесійныя навыкі ў канкрэтнай сферы дзейнасці будучага спецыяліста.

Стварэнне новага тыпу дапаможніка дазволіць вырашаць адразу некалькі дыдактычных задач: актуалізацыю і пашырэнне ўжо атрыманых ведаў, засвойванне новага тэарэтычнага матэрыялу ў інавацыйнай дыялогавай форме, актыўна ўключаць у навучальны працэс аўдыя- і відэаматэрыял з мэтай паспяховага засваення атрыманай інфармацыі, актывізаваць самастойную працу студэнтаў, што ў сённяшніх умовах развіцця вышэйшай школы становіцца стратэгічна важнай задачай, палегчыць і разнастаіць сістэму самакантролю і кантролю засвоеных ведаў з боку выкладчыкаў, развіваць творчыя навыкі ў будучых кіраўнікоў.

## Літаратура

1. Современный электронный учебно-методический комплекс – основа информационно-образовательной среды вуза / П.А. Мандрик, А.И. Жук, Ю.В. Воротницкий // Информатизация образования-2010: педагогические аспекты создания информационно-образовательной среды: материалы междунар. науч. конф., Минск, 27 - 30 октября 2010 г. – Минск : БГУ, 2010 г. – С. 197-201.

2. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (Прафесійная лексіка). Вучэбны дапможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ па педагагічных спецыяльнасцях / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2008. – 280 с.

3. Асіпчук, А.М. Беларуская мова. Прафесійная лексіка / А.М. Асіпчук, В.В. Маршэўская, А.С. Садоўская. – Гродна, 2008. – 271 с.

4. Дапаможнік па курсу "Беларуская мова. Прафесійная лексіка" / складальнікі: Занкавіч А.П., Капусціч Т.М., Смалянка Г.А. Мінск, 2004. – 148 с.

5. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў усіх форм навучання ўсіх спецыяльнасцей БДУІР / Аўтары: Л.А.Бондар, Н.Г. Вайніла, М.А. Галянок і інш.; пад рэд. Ю.А. Сцепанчука.– Мінск: БДУІР, 2006. – 69 с.

6. Зянько, А.І. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці "Правазнаўства" / А.І Зянько, С.А. Вялюга. – Наваполацк: ПДУ, 2005. – 308 с.

7. Гіруцкая, Л.А. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў БНТУ. У 4 ч. Ч. 1 / Л.А. Гіруцкая [і інш.]. – Мінск: БНТУ, 2005. – 289 с.